# БАРАЦЬБІТ, ПАТРЫЁТ, ЧАЛАВЕК-ЛЕГЕНДА

## Выстава пра жыццё Сяргея Прытыцкага падарожнічае па Гродзеншчыне

**Перасоўную выставу, прысвечаную жыццю і дзейнасці Сяргея Прытыцкага, арганізаваў Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, паведаміў карэспандэнту БелТА дырэктар музея Юрый КІТУРКА.**

«Напярэдадні Дня народнага адзінства выстава ўжо пабывала ў Астраўцы, Смаргоні, Іўі, Лідзе, — распавёў кіраўнік установы культуры. — У Гродне яна будзе прадстаўлена ў абласной філармоніі, дзе пройдзе ўрачысты сход у гонар усенароднага свята. Адразу пасля гэтага выстава адправіцца ў Свіслач, дзе будзе экспанавацца ў раённым краязнаўчым музеі, пасля чаго працягне падарожнічаць па рэгіёне».

Аўтары прадставілі матэрыялы, дакументы, фатаграфіі і іншыя экспанаты, якія распавядаюць пра перыяд барацьбы беларускага народа за ўз'яднанне, падзеі верасня 1939-га і савецкае будаўніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі, ваенныя гады і пасляваеннае аднаўленне праз прызму камсамольскай, партыйнай і дзяржаўнай дзейнасці Сяргея Восіпавіча Прытыцкага.

Сярод экспанатаў — станок, які выкарыстоўваўся для друку нелегальнай літаратуры (у Гродне, на вуліцы Ласасянскай, дзейнічала адна з першых падпольных друкарняў КПЗБ). Шырока прадстаўлены транспаранты, з якімі працоўныя выходзілі на мітынгі. Галоўным патрабаваннем, пазначаным на іх, было ўз'яднанне Заходняй Беларусі з Савецкай Беларуссю, якая магла гарантаваць бяспеку шырокім масам працоўнага сялянства. Адным з лідараў гэтага руху быў Сяргей Прытыцкі.

На фота Прытыцкага, зробленым у Гродзенскай турме, куды ён быў зняволены за рэвалюцыйную дзейнасць пасля ўступлення ў 1932 годзе ў шэрагі КПЗБ і абрання сакратаром Гродзенскага акруговага камітэта камсамола, сляды жорсткага збіцця. Так польскія ўлады выбівалі паказанні. Тут жа — форма польскага паліцэйскага таго часу і побач з ёй — гумавая дубінка. Зрэшты, для падаўлення пратэстаў паліцыя магла выкарыстоўваць і агнястрэльную зброю.

У 1936-м Прытыцкі зноў трапіў у рукі паліцыі. Па заданні партыі ён страляў у Віленскім акруговым судзе ў правакатара і даносчыка, з-за якога былі арыштаваныя многія камсамольцы і камуністы. Прытыцкі параніў здрадніка ў галаву, але і сам быў паранены, арыштаваны і прысуджаны да смяротнага пакарання. Аднак польскім уладам прыйшлося перагледзець прысуд пад ціскам грамадскасці. На выставе можна ўбачыць, пад якімі лозунгамі і кумачовымі транспарантамі людзі выходзілі на мітынгі ў падтрымку Прытыцкага.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*